# ВОБРАЗЫ МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў МАЛЯВАНЫХ ДЫВАНАХ ІРЫНЫ ЦЕРАШКОВАЙ

***Р. Ф. Шаура,***
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар,*
*загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Вобраз малой радзімы ва ўсе часы быў шырока адлюстраваны ў народнай творчасці і ва ўсіх відах мастацтва. Менавіта словы «малая радзіма» змяшчаюць глыбінны сэнс, які ўбірае ў сябе пачуцці і асацыяцыі, звязаныя з месцам нараджэння кожнага з нас, дзяцінствам, бацькамі, домам, дарагімі і блізкімі людзьмі. Праз гады, дзе б мы не знаходзіліся, кім бы не славіліся ў іерархічнай лесвіцы соцыума, родны ачаг настальгічна нас вабіць, нібы кліча на сустрэчу з мінулым, беззваротна адыходзячым у імклівым патоку часу. І натуральна, шматлікія літаратары, сцэнарысты і мастакі беражліва праносяць праз сваю асобасную творчасць глыбокую і невычэрпную тэму вялікай або малой радзімы, дарагую для кожнага чалавека.

Адным з цікавых прадстаўнікоў народнай творчасці, які значнае месца ў маляваных дыванах адводзіць роднаму краю, традыцыям малой радзімы, з'яўляецца Ірына Церашкова з г. Лёзна Віцебскай вобласці.

Трэба адзначыць, што цікавасць культуролагаў і мастацтвазнаўцаў да маляваных дываноў праявілася ў 70-е гады XX ст. пасля спецыялізаваных выстаў, на якіх былі прадстаўлены аўтэнтычныя экспанаты з музейных збораў і асабістых калекцый прафесійных мастакоў. Значны ўклад у працэс збірання маляваных дываноў у канцы другой паловы XX ст. унеслі мастакі, работнікі музеяў, а таксама метадысты абласных цэнтраў народнай творчасці. Пэўная колькасць маляваных дываноў знаходзіцца ў Заслаўскім гісторыка-краязнаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чым музеі-запаведніку. Звыш 170 твораў налічваюць фонды музея, якія складаюць унікальны збор народнага мастацтва.

Актыўнае развіццё гэтага віду народнага мастацтва ўсё ж прыпадае на перыяд 1930–1950-х гг., хоць маляваныя дываны ствараліся не толькі ў гэты час. Справа ў тым, што такія творы, выкананыя на паперы, тканіне, цыраце, не маглі доўга захоўвацца, таму іх старадаўнія ўзоры не дайшлі да нашага часу. Што тычыцца перыяду першай паловы XX ст., то ў большасці раёнаў нашай рэспублікі маляваныя дываны былі ў кожнай сялянскай хаце. Мастацтвам роспісу дываноў займаліся не толькі вандроўныя творцы. У буйных вёсках і мястэчках жылі і працавалі мастакі-жывапісцы, якія выконвалі заказы «на даму». Попыт на такую мастацкую прадукцыю быў вялікім, і таму гэты від народнага мастацтва развіваўся на хвалі натуральнай і паўсядзённай у ім патрэбы. Маляваныя дываны станавіліся важным прадметам эстэтызацыі інтер’ера жылога памяшкання, сродкам далучэння чалавека да мастацкай культуры.

Сюжэтна-тэматычныя маляваныя дываны, як правіла, прасякнутыя жыццесцвярджальным аптымізмам, эпічнай абагульненасцю. Іх характарызуюць душэўная аўтарская адкрытасць і наіўная, шчырая непасрэднасць мастацкага апавядання. Тут назіраюцца своеасаблівая кананізацыя ў прадметна-кампазіцыйным рашэнні, выяўленчы лаканізм у адлюстраванні таго ці іншага дзеяння. Каб надаць твору эстэтычную завершанасць, у большасці выпадкаў структура кампазіцыі будавалася на спалучэнні маляўніча-станковых і дэкаратыўных элементаў. Цэнтр дывана адводзіўся для выяўленчага адлюстравання дзеючай сцэны або пейзажу, а яго край па перыметры ўпрыгожваўся арнаментыкай разнастайных кветак.

Што тычыцца творчасці Ірыны Церашковай, то перш чым прыступіць да выканання маляванкі, яна вельмі ўважліва вывучае мясцовы матэрыял (міф, легенду, народнае паданне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старажытныя сімвалы і іх значэнне), творча яго пераасэнсоўвае і на аснове вывучанага матэрыялу распрацоўвае эскіз у натуральным памеры. Прынцып кампазіцыйнай пабудовы і сам малюнак мае замкнёны, плоскасны, падкрэслена дэкаратыўны характар. Назва «маляванка» адлюстроўвае яго змест. Кожная дэталь у кампазіцыі нясе канкрэтную сэнсавую нагрузку, з'яўляецца своеасаблівым знакам, сімвалам. Маляванкі заўсёды кампазіцыйна закончаныя, усе элементы маштабна ўзгоднены адзін з адным. У маляванцы «Варажэі», напрыклад, яна закранае тэматыку свята «Купалле». У даўнія, яшчэ дахрысціянскія часы, у ноч летняга сонцастаяння з 21 на 22 чэрвеня, людзі святкавалі Купала, схіляючыся перад культам прыроды. Менавіта ў гэтую ноч вада абнаўлялася і зараджалася магічнай энергіяй. Вада з'яўлялася самым неадназначным міфалагічным сімвалам – гэта адна з першых стыхій светабудовы, крыніца жыцця (мал. 2).

З даўніх часоў у г. Лёзна праз раку Мошна пракладзены мост, на якім сустракаліся закаханыя. Так яшчэ ў тыя часы з'явілася назва «Мост закаханых». Некалькі гадоў таму замест старога маста пабудавалі новы і жыхары Лёзна напісалі артыкул у мясцовую газету, дзе прапанавалі новаму масту даць назву «Мост закаханых», як і ў даўнія часы. На аснове гэтай легенды Ірына Церашкова распрацавала сюжэт для маляванкі: сустрэча Марка Шагала з Бэлай на мосце, дзе маляўніча да іх схіляюцца вербы, квітнеюць на вадзе гарлачыкі, плаваюць лебедзі. Час для іх як быццам спыніўся, але жыццё ідзе сваім парадкам: хтосці вядзе карову, нехта нясе ваду на каромыселе, побач пасуцца козы. У кайме маляванкі размешчана гірлянда з васількоў, любімых кветак Марка Шагала (мал. 1). Шагалаўскую тэму мастачка абрала не выпадкова, бо ў г. Лёзна калісьці жылі шматлікія сваякі Марка Шагала, да якіх ён часта прыязджаў у госці. У г. Лёзна мастак стварыў шмат сваіх прац, у тым ліку з так званай «Віцебскай серыі». Упершыню маляванка «Мост закаханых у мястэчку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лёзна» была прадстаўлена на V Нацыянальнай выставе наіўнай творчасці «INSITA – 2016», прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Алены Кіш (г. Віцебск, 2016 г.). У 2017 г. праца была прадстаўлена на V Маскоўскім міжнародным фестывалі наіўнага мастацтва «Фестнаив – 2016», у Музеі рускага лубка і наіўнага мастацтва.

У маляванцы «Макош – ніткі лёсу» мастачка паспрабавала расказаць пра тое, як чалавечае жыццё па сутнасці складанае непрадказальнае і што чалавеку трэба цаніць і шанаваць кожны свой пражыты дзень. Макош – багіня дажджу і ўрадлівасці. Яна маці ўсяго ўраджаю, заступніца жаночага пачатку і працягу роду. Макош ўвасабляе культ месяца, бо становішча месяца, яго колер, фаза – усё гэта мела велізарнае значэнне для народнай «астралогіі». Месяц вызначаў не толькі распарадак дня сельскагаспадарчых работ, але і прама ўплываў на чалавека, яго лёс. Таксама вобраз Макошы звязваюць з прадзеннем і ткацтвам, яе лічылі багіняй, прамаці нябесных ніцей лёсу. Верылі ў тое, што калі пража доўгая і роўная, то чалавек нараджаўся са шчаслівым лёсам, а калі нітка парвецца, то жыццё чалавека раптам абрывалася. Таму прасілі: «Выпрадзі, Макош, лёсы нам доўгія ды роўныя! Саткі, Макош, іх у тканіну жыцця, гладкую ды ладную!» У цэнтры маляванкі намалявана яблыня, як сімвал урадлівасці, плаўна пераходзячая ў калаўрот. У аснове калаўрота верацяно, як вось Сусвету. Яго сакральнасць тлумачыцца самім дзеяннем: з хаатычнай кудзелістай масы прадзецца спарадкаваны пачатак – нітка. Уверсе, над верацяном старажытны, моцна стылізаваны сімвал працы (пчаліны рой), які з'яўляецца прадвеснікам багіні Макошы. У аблямоўцы маляванкі – ільняное поле са старажытнымі сімваламі ўрадлівасці, бо праца заўсёды была асновай жыцця нашых продкаў (мал. 3).

Ірына Церашкова з 2002 г. – удзельніца выстаў і фестываляў народнай творчасці абласнога і міжнароднага ўзроўню, лаўрэат абласных і рэспубліканскіх выстаў дэкаратыўна-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

прыкладнога мастацтва, узнагароджана дыпломам першай ступені на міжнародным свяце-конкурсе майстроў традыцыйнага і сучаснага мастацтва ў рамках XXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» за адраджэнне і развіццё традыцыйнага мастацтва.



*Мал. 1.* Маляванка «Мост закаханых»



*Мал. 2.* Маляванка «Варажэі»



*Мал. 3.* Маляванка «Макош – ніткі лёсу»

# МАЛАЯ РОДИНА – ИСТОКИ ТВОРЧЕСТВА ХАИМА СУТИНА И ШРАГИ ЦАРФИНА


***Н. Е. Шелупенко*,**

*кандидат культурологии,*

*доцент кафедры межкультурных коммуникаций*

*Белорусского государственного университета культуры и искусств*


История знает немало примеров, когда уроженцы Беларуси, которые жили за ее пределами и получили всемирную известность, оставались неизвестными на родине. Среди них выдающиеся художники, представители Парижской школы Хаим Сутин и Файбиш-Шрага Царфин, чей жизненный и творческий путь начался в белорусском местечке Смиловичи (сейчас это городской поселок в Червенском районе Минской области).

РЕПОЗИТОРИЙ ... УКИ